УДК 94 (476) «1918/1939» + 930.25 (476.1)(091)

***А.М. Вабішчэвіч***

*д-р гіст. навук, дац., заг. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*

# ДАКУМЕНТЫ ЗАНАЛЬНАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА Ў г. МАЛАДЗЕЧНА ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАГА РЭГІЁНУ Ў 1918–1939 гг.

*У артыкуле аўтар падводзіць вынікі архіва- і крыніцазнаўчага даследавання, выкананага ў межах сумеснага польска-беларускага праекта «Польшча – Беларусь. Агульная гістарычная спадчына». Аб'ектам вывучэння сталі дакументальныя зборы 1918–1939 гг. Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна. Яны ўключаюць матэрыялы пра Браслаўскі, Вілейскі, Віленска-Трокскі, Дзісенскі, Дунілавіцкі, Маладзечанскі, Ашмянскі, Пастаўскі, Свянцянскі паветы Віленскага ваяводства і Валожынскі павет Навагрудскага ваяводства ў складзе Польшчы паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі. Праведзены аналіз наяўных фондаў, вопісаў фондаў, ступені захаванасці змешчаных у іх спраў, дадзена праблемна-тэматычная характарыстыка архіўных матэрыялаў і вызначаны перспектывы іх выкарыстання.*

## Уводзіны

Гісторыя Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна пачалася пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. 11 лютага 1940 г. быў утвораны Дзяржаўны архіў Вілейскай вобласці. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны там налічвалася 60 фондаў, якія ўтрымлівалі 130 тыс. адзінак захавання [1, с. 3–4; 2; 3, с. 35]. Вялікія страты архіўныя зборы панеслі ў час Вялікай Айчыннай вайны. У пачатку вайны толькі частка архіўных дакументаў, якія мелі грыф сакрэтнасці, была эвакуіравана з Вілейкі ў г. Шадрынск Чалябінскай вобласці [3, с. 37]. Тыя дакументальныя матэрыялы, якія засталіся ў Вілейцы, у ходзе баявых дзеянняў і нямецка-фашысцкай акупацыі былі знішчаны. Знішчэнню падвергліся і раённыя архівы Маладзечанскай вобласці, размешчаныя ў Ільі, Крывічах, Паставах, Радашковічах, Свіры, Смаргоні [3, с. 40, 42–43].

У ліпені 1944 г. была адноўлена праца архіва ў Вілейцы. У сувязі з перайменаваннем Вілейскай вобласці ў створаную Маладзечанскую вобласць у верасні таго ж года архіў быў перайменаваны ў Дзяржаўны архіў Маладзечанскай вобласці і перамясціўся ў Маладзечна. У студзені 1960 г. архіў быў пераўтвораны ў філіял Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці ў г. Маладзечна. Да 2009 г. ён размяшчаўся на Лібава-Роменскай вуліцы, 69 у былым будынку турмы польскага Корпуса памежнай аховы. З 1996 г. архіў перайменаваны ў Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна. У 2009 г. гэтая архіўная ўстанова перасялілася ў новы будынак на вуліцы Вялікі Гасцінец, 113Б.

Асноўная праца па навукова-тэхнічнай апрацоўцы наяўных матэрыялаў, складанні вопісаў фондаў архіва была праведзена ў 1947–50-я гг. Шэраг архіўных збораў паступіў з архіўных устаноў Масквы і Вільнюса (сярод іх – матэрыялы староства, камендатуры дзяржаўнай паліцыі Ашмянскага павета, Барунскай дзяржаўнай мужчынскай настаўніцкай семінарыі і інш.). З Дзяржаўнага архіва Ровенскай вобласці (Украіна) перададзены дакументы пастарунка дзяржаўнай паліцыі ў Аляхновічах Маладзечанскага павета. Да 1954 г. матэрыялы, якія датычылі Браслаўскага, Дзісенскага паветаў, Віленскага ваяводскага ўпраўлення і інш., захоўваліся ў Дзяржаўным архіве Полацкай вобласці і гарадскім архіве ў Полацку; пасля 1954 г. яны былі перавезены ў Дзяржаўны архіў Маладзечанскай вобласці. Адначасова з навукова-тэхнічнай апрацоўкай дакументаў праводзілася экспертыза іх каштоўнасці.

У наступныя дзесяцігоддзі адбывалася ўдасканаленне навукова-тэхнічнай апрацоўкі (нумарацыя лістоў, падшыўка спраў, перадрукаванне вопісаў), правядзенне паадзінкавай каталагізацыі. У 1990-я гг. у выніку рассакрэчвання адбывалася перадача дакументаў на адкрытае захоўванне.

Для паслуг карыстальнікаў былі створаны структурна-храналагічныя, геаграфічныя, геаграфічна-прадметныя паказальнікі да асобных фондаў. Супрацоўнікі архіва выкарыстоўваюць камп'ютарную базу да геаграфічнага паказальніка некаторых фондаў. Агульны пералік фондаў (без аналізу зместу іх вопісаў) быў выкладзены ў выдадзеных архіўных даведніках [1, с. 4–5]. Пералік фондаў Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна ў сукупнасці з іншымі айчыннымі архіўнымі ўстановамі змешчаны ў тэматычных архіўных даведніках па гісторыі Праваслаўнай Царквы, яўрэйскай супольнасці Беларусі [6–7]. На працягу 1950–80-х гг. крыніцы з гэтага архіва публікаваліся ў зборніках дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг., асобных манаграфічных даследаваннях, перыядычным друку. З 1990-х гг. разгарнулася ўвядзенне ў навуковы абарот новых архіўных крыніц [8–10]. Асобныя матэрыялы былі выкарыстаны ў гісторыка-дакументальных хроніках «Памяць» [11–19]. Інфармацыя пра фонды Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна была ўключана ў фондавы каталог дзяржаўных архіваў Рэспублікі Беларусь [20]. Нягледзячы на гэта, цэлы шэраг архіўных масіваў у Маладзечне, якія датычаць заходнебеларускага перыяду, яшчэ не ўведзены ў навуковы ўжытак. Як беларускія, так і замежныя даследчыкі да апошняга часу не ўяўлялі іх сапраўдных аб'ёмаў і навуковай вартасці. Улічваючы гэтыя акалічнасці, у ходзе выканання сумеснага польска-беларускага праекта быў падрыхтаваны архіўны даведнік з аналізам фондаў і вопісаў [21, с. 21–124, 146–153, 157–261, 297–304], а таксама распрацавана пошукавая база звестак (на беларускай і польскай мовах) [22]. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца якраз падвядзенне вынікаў згаданага архіва- і крыніцазнаўчага даследавання. Для дасягнення пастаўленай мэты былі зроблены абагульненні сабраных якасных і колькасных паказчыкаў фондаў, вопісаў і адзінак захавання, прааналізаваны змест усіх фондаў і вопісаў, высветлена гісторыя архіўных збораў.

**Дакументальныя архіўныя матэрыялы: праблемна-тэматычная характарыстыка, стан захавання, колькасныя паказчыкі, перспектывы выкарыстання**

Паводле звестак з падрыхтаванай табліцы, найбольш шматлікімі і добра захаванымі з'яўляюцца дакументальныя матэрыялы мясцовых органаў польскай дзяржаўнай улады, якія згрупаваны ў 24 фонды (17 380 адзінак захавання). З іх асабліва вылучаецца фонд 438 «Віленскае ваяводскае ўпраўленне» (6 846 адзінак захавання). Там можна знайсці дакументы аб адміністрацыйна-арганізацыйнай, фінансавай і гаспадарчай дзейнасці Віленскага ваяводскага ўпраўлення, эканамічнай сітуацыі, стане сельскай гаспадаркі на Віленшчыне, стварэнні і дзейнасці павятовых старостваў, правядзенні парцэляцыі, хутарызацыі сялянскіх гаспадарак, ліквідацыі сервітутаў, пашырэнні вайсковага і цывільнага асадніцтва, стане дзяржаўных і прыватных лясоў, арганізацыі гандлю, ветэрынарнага нагляду, рыбнай гаспадаркі, наглядзе за лясамі і інш.

Акрамя дакументаў Віленскага ваяводскага ўпраўлення ў архіве захоўваюцца матэрыялы павятовых старостваў Віленскага ваяводства (Браслаўскага, Вілейскага, Віленска-Трокскага, Дзісенскага, Дунілавіцкага, Маладзечанскага, Ашмянскага, Пастаўскага, Свянцянскага паветаў) і Валожынскага павета Навагрудскага ваяводства. У іх утрымліваюцца каштоўныя звесткі пра розныя бакі жыцця мясцовага насельніцтва. Так, у фондзе 436 «Браслаўскае павятовае староства» (1919–1939 гг.), у якім налічваецца 2 717 адзінак захавання, ёсць матэрыялы аб устанаўленні шкоды, нанесенай Першай сусветнай і польска-савецкай войнамі, і мерах па аказанні дапамогі пацярпеламу насельніцтву, аб рэпатрыяцыі насельніцтва з Савецкай Расіі, абкладанні і спагнанні падаткаў з насельніцтва, стане, будаўніцтве і рамонце ваяводскіх і павятовых дарог, мастоў, арганізацыі і дзейнасці школ, культурна-асветніцкай працы, барацьбе з інфекцыйнымі захворваннямі, аб канфесійным становішчы ў Браслаўскім павеце, выдачы часовых пропускаў для выезду ў Латвію і Літву на сезонныя сельскагаспадарчыя работы і інш.

У фондзе 3 «Вілейскае павятовае староства» знаходзіцца 1 209 спраў. У вопісе 1 гэтага фонда захоўваецца перапіска з Віленскім ваяводскім ўпраўленнем, праўленнямі гмін, праекты каштарысаў даходаў і расходаў Вілейскага староства, справы аб куплі-продажы зямель маёнткаў, фальваркаў, аб перасяленні сялян на хутары, ліквідацыі сервітутаў, арэндзе зямлі, аб усталяванні межаў і абмеры зямельных участкаў, надзяленні ваенных асаднікаў зямлёй, анкеты і характарыстыкі на асоб, якія падазраваліся ў супрацоўніцтве з КПЗБ, кнігі ўліку арыштаваных, заявы грамадзян аб атрыманні пасведчанняў асобы і пашпартоў, выдачы дазволаў на рыбалоўства ў рацэ Вілія і інш. Вопісы 2 і 3 таго ж фонда ўтрымліваюць рэестры размежавання землеўладанняў, планы, праекты і эскізы зямель населеных пунктаў.

Як сведчаць дакументы начальніка 1-га раёна Ашмянскага павета (ф. 382), у час дзейнасці Грамадзянскага ўпраўлення ўсходніх зямель у 1919–1920 гг. у яго структуры былі створаны асобныя камісіі па ўліку ваенных страт насельніцтва ў гады Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў. 14 лістапада 1921 г. ашмянскі павятовы стараста даручыў каменданту паліцыі, начальнікам раёнаў, войтам гмін Ашмянскага павета, бурмістру г. Ашмяны давесці насельніцтву інфармацыю аб створанай у Вільні камісіі па рэгістрацыі ваенных страт на тэрыторыі Сярэдняй Літвы. «Да сферы дзеяння гэтай камісіі належыць найперш прыняцце дэкларацый аб кампенсацыі за рэквізаваную, забраную ці знішчаную маёмасць расійскімі, нямецкімі, бальшавіцкімі, польскімі і літоўскімі войскамі. Акрамя таго, камісія займалася справай рээвакуацыі маёмасці, вывезенай у Расію і Украіну» [23, арк. 1].

У архіве захоўваюцца матэрыялы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Сейм і Сенат Польшчы 1930, 1935, 1938 гг., якія ахоплівалі сваёй дзейнасцю тэрыторыю Ашмянскага, Вілейскага, Маладзечанскага, Браслаўскага, Дзісенскага, Пастаўскага паветаў Віленскага ваяводства (фонды 392, 393, 396, 480, 481, 547).

Не такімі аб'ёмнымі з'яўляюцца фонды органаў мясцовага самакіравання (гарадскія ўправы, гмінныя ўправы і інш.): у 21 фондзе ўтрымліваецца 249 спраў. Так, фонд 494 «Магістрат г. Дзісны» мае толькі 1 справу – бюджэт магістрата гэтага горада на 2-е паўгоддзе 1923 г. У нешматлікіх па аб'ёме фондах гмінных управ ёсць пратаколы, карэспандэнцыя, бюджэты і справаздачы аб іх выкананні, інфармацыя аб становішчы сельскай гаспадаркі, гандлю, стане лясоў, камасацыі зямлі, дзейнасці грамадскіх арганізацый ў гмінах, будаўніцтве і рамонце будынкаў, дарог, мастоў, школ, санітарным становішчы і барацьбе з эпідэміямі, аб стратах, панесеных жыхарамі гмін у час Першай сусветнай вайны, заявы жыхароў аб выдзяленні ім матэрыяльнай дапамогі, выдачы будаўнічых матэрыялаў, інфармацыя аб падаткаабкладанні насельніцтва, статыстычныя звесткі аб колькасці насельніцтва і інш. Найбольш шматлікія, хоць і не поўныя (усяго 78 спраў), – дакументы праўлення гміны Жосна Пастаўскага павета (фонд 56).

Табліца. – Праблемна-тэматычная характарыстыка дакументаў 1918–1939 гг., якія захоўваюцца ў Занальным дзяржаўным архіве ў г. Маладзечна

| | Колькасць фондаў | Колькасць вопісаў фондаў | Колькасць адзінак захавання (спраў) |
|---|---|---|---|
| Выбары ў Сейм і Сенат | 6 | 14 | 773 |
| Мясцовыя органы дзяржаўнай улады (ваяводскае ўпраўленне, павятовыя староствы і інш.) | 24 | 36 | 17 380 |
| Органы мясцовага самакіравання (гарадскія магістраты, праўленні гмін і інш.) | 21 | 23 | 249 |
| Органы паліцыі, суды, пракуратура, турмы, натарыят | 34 | 44 | 8 178 |
| Армія, памежная служба, ваенізаваныя арганізацыі | 19 | 19 | 353 |

*Працяг табліцы*

| | | | |
|---|---|---|---|
| Фінансавыя органы | 2 | 2 | 3 |
| Органы сацыяльнага забеспячэння | 2 | 2 | 10 |
| Сельская гаспадарка | 18 | 18 | 9 876 |
| Сувязь | 2 | 2 | 7 |
| Грамадскія арганізацыі | 10 | 10 | 22 |
| Установы адукацыі | 5 | 5 | 238 |
| Ацэнка і ліквідацыя разбуральных вынікаў Першай сусветнай вайны | 6 | 6 | 8 486 |
| Усяго: | 149 | 181 | 45 575* |

* *Заўвага: падлічана паводле [1, с. 14–43]. (Аднак зробленыя аўтарам у жніўні 2014 г. падлікі згодна вопісаў фондаў архіва даюць наступны сумарны аб'ём гэтых фондаў – 47 898 адзінак захавання. Мяркуем, што пэўныя разыходжанні па асобных фондах павятовых старостваў звязаны з неабходнасцю ўдасканалення вопісаў фондаў.*

Нягледзячы на нешматлікасць, матэрыялы гмінных праўленняў дазваляюць прааналізаваць погляды заходнебеларускіх жыхароў, іх злабадзённыя клопаты. Напрыклад, перапіска Мядзельскага гміннага праўлення 1925 г. паказвае аб пашырэнні прасавецкіх настрояў мясцовага насельніцтва: «Некаторыя грамады (Сваткі, Старынкі, Андрэйкі, Вузла, Мацькаўцы, Марцянаўцы, Калінаўка і частка вёсак, што ляжаць побач з названымі грамадамі, наскрозь прасякнуты ўплывам закардоннай агітацыі, духам бальшавізму. Насельніцтва ў названых грамадах выключна праваслаўнае» [24, арк. 2]. Таксама разгортваўся рух за адкрыццё беларускіх школ у вёсках Канчаны, Калінаўка, Навасёлкі, Старынкі і інш. [24, арк. 5, 7, 10].

Група фондаў органаў паліцыі, судоў, пракуратуры, турмаў, натарыусаў (8 178 адзінак) ахоплівае 8 павятовых камендатур дзяржаўнай паліцыі (у Браславе, Вілейцы, Дзісне, Дунілавічах, Маладзечне, Ашмянах, Паставах, Валожыне), 19 міравых (гарадскіх) судоў, 2 пракуратуры, 2 турмы (у Вілейцы і Ашмянах). Большасць з іх яшчэ чакае выяўлення даследчыкамі і ўвядзення ў навуковы ўжытак. Акрамя крымінальных і грамадзянскіх спраў, у іх прадстаўлены цыркуляры, указанні Міністэрстваў юстыцыі, фінансаў II Польскай Рэспублікі, Віленскага акруговага суда, перапіска з судовымі і следчымі органамі аб злачынствах, пратаколы дазнання і допытаў грамадзян і інш. Дакументы асобных фондаўтваральнікаў (судоў і інш.) фрагментарныя і маюць адзінкавыя справы. У асабовым фондзе ашмянскага натарыуса Яна Юрэвіча (фонд 543) ёсць натарыяльныя акты і дадаткі да іх, кнігі ўліку векселяў, копій дакументаў і апратэставаных векселяў.

Акрамя асабовых спраў супрацоўнікаў і служачых, зняволеных, асуджаных за палітычную дзейнасць, крымінальна-бытавыя, службовыя і воінскія злачынствы, парушэнне тытунёвай, спіртной і цукровай дзяржаўнай манаполіі, парушэнне ўстаноўленых правілаў (супрацьпажарная бяспека, санітарныя нормы, вулічны рух і інш.), у фондзе 111 «Ашмянская павятовая турма» (2 340 адзінак захавання) знаходзяцца таксама цыркуляры, загады, указанні, распараджэнні вышэйстаячых міністэрстваў і ведамстваў Польшчы, перапіска, рапарты начальніка Ашмянскай турмы аб стане кадраў, справаздачы аб санітарным становішчы, каштарысы расходаў турмы, прыходна-расходныя касавыя кнігі, статыстычныя звесткі аб колькасці і руху зняволеных і інш.

Сярод фондаў польскіх армейскіх і памежных фарміраванняў, ваенізаваных арганізацый вылучаецца фонд 5 «Полк "Вілейка" Корпуса памежнай аховы» (272 адзінкі захавання). Там знаходзяцца загады, інструкцыі Міністэрства ўнутраных спраў міжваеннай Польшчы, Корпуса памежнай аховы, камандавання палкоў і батальёнаў, перапіска з рознымі ўстановамі, пратаколы сходаў афіцэраў, статыстычныя звесткі аб колькасці насельніцтва, звесткі аб злачынствах і парушэннях воінскай дысцыпліны, матэрыялы аб барацьбе са шпіёнскай дзейнасцю і нелегальным пераходам дзяржаўнай мяжы, руху насельніцтва ў пагранічнай зоне, данясенні інфарматараў і інш.

Змястоўная інфармацыя аб стане сельскай гаспадаркі ўтрымліваецца ў матэрыялах Віленскага акруговага зямельнага ўпраўлення (фонд 439), Ашмянскага, Браслаўскага, Маладзечанскага, Пастаўскага павятовых зямельных упраўленняў. Сярод дакументаў фонда 439 ёсць звесткі пра парцэляцыю зямель маёнткаў, землеўпарадкаванне населеных пунктаў, правядзенне меліярацыйных работ, вызначэнне і выпраўленне межаў зямель вёсак, маёнткаў, перасяленне сялян на хутары, ліквідацыю сервітутаў, надзяленне зямлёй ваенных асаднікаў, дакументы аб правядзенні землеўпарадкавальных работ, характарыстыкі маёнткаў, зямельных участкаў, геаграфічна-тапаграфічнае, юрыдычна-гістарычнае апісанне возера Нарач 1925 г., выпіскі з іпатэчных кніг з апісаннем межаў, памераў землеўладання і інш.

З шэрагу ўстаноў адукацыі ў архіве захоўваецца дакументальная спадчына дзяржаўнай мужчынскай настаўніцкай семінарыі ў мястэчку Баруны Ашмянскага павета за 1921–1932 гг. (фонд 204). Гэта не толькі асабовыя справы і спісы выкладчыкаў, навучэнцаў, але і пратаколы пасяджэнняў педагагічнага савета семінарыі за 1925–1929 гг., папячыцельскага савета пры семінарыі, экзаменацыйных камісій, планы вучэбнай працы, праекты бюджэтаў і каштарысаў бюджэту семінарыі, касавыя кнігі, перапіска з папячыцельствам Віленскай школьнай акругі, справаздачы і звесткі аб стане, працы і выніках дзейнасці семінарыі, колькасці выкладчыкаў і навучэнцаў, паспяховасці навучэнцаў семінарыі і пачатковай школы пры семінарыі, фізічным выхаванні навучэнцаў, рэвізіі па фінансава-гаспадарчай дзейнасці семінарыі і яе інтэрната, расклады ўрокаў, табелі паспяховасці навучэнцаў, заявы абітурыентаў аб допуску да ўступных экзаменаў і залічэнні ў семінарыю, ведамасці вынікаў здачы ўступных экзаменаў і інш.

Заявы абітурыентаў і навучэнцаў – даволі арыгінальныя і змястоўныя дакументы, якія дазваляюць часткова прасачыць тагачасную паўсядзённасць. Так, 17-гадовы жыхар мястэчка Трабы Валожынскага павета А. Пятроўскі звяртаўся 2 жніўня 1928 г. да кіраўніка Віленскага школьнага папячыцельства аб прыняцці яго на вучобу ў настаўніцкую семінарыю ў Барунах і вызваленні ад платы за вучобу: «Паходжу з беднай сям'і, мой бацька – селянін, які мае 2 гектары зямлі, а рэшту мусіць працаваць на чужой зямлі, што дае заробкі толькі на пражыццё сям'і, так што бацька не можа мне даць ніякіх грошай на вучобу» [25, арк. 324].

Ацэнка і ліквідацыя разбуральных вынікаў Першай сусветнай вайны ажыццяўлялася адпаведна павятовымі камісіямі па рэгістрацыі ваенных стратаў і дзяржаўнымі бюро аднаўлення (усяго 8 486 адзінак захавання). Там знаходзяцца шматлікія матэрыялы па ўліку шкоды, нанесенай гаспадаркам сялян і грамадзянам у час баявых дзеянняў Першай сусветнай і польска-савецкай войн, аказанні дапамогі насельніцтву і кампенсацыі ўрону і інш. Фонд 350 «Камісія па рэгістрацыі ваенных стратаў у Ашмянскім павеце» (1919–1923 гг.) уключае цыркуляры, распараджэнні і аб'явы Грамадзянскага ўпраўлення ўсходніх зямель, пратаколы пасяджэнняў павятовай камісіі, перапіску з Цэнтральнай камісіяй па рэгістрацыі ваенных страт II Польскай Рэспублікі, справаздачы аб рэгістрацыі шкоды, нанесенай гаспадарцы і грамадзянам Ашмянскага павета баявымі дзеяннямі, заявы грамадзян аб кампенсацыі шкоды і атрыманні пазыкі за страты і інш.

Пацярпелі ў ваенны час і культавыя будынкі. Духавенства і вернікі дамагаліся вяртання вывезеных царкоўных каштоўнасцей у час Першай сусветнай вайны. Напрыклад, страты былі нанесены касцёлу Святога Іаана Хрысціцеля ў Гальшанах Ашмянскага павета. «22 жніўня 1915 года паводле распараджэння галоўнага начальніка ваеннай акругі былі забраны з парафіяльнага касцёла ў Гальшанах 3 званы агульнай вагой 1 815 фун.(таў) і вывезены ў Расію – і парафія засталася зусім без званоў» [26, арк. 1]. У спісе страт было адзначана наступнае: «Вывезены ў Расію 3 касцёльныя званы старажытнай работы, адлітыя з медзі і серабра агульнай вагой 1 815 фунтаў па 5 васьмушак фунт = 9 075 васьмушак золатам» [26, арк. 5]. Разбуральнымі былі вынікі баявых дзеянняў для рымска-каталіцкай парафіі ў Смаргоні. «У час расійска-нямецкай вайны

немцамі была разбурана святыня, якую мы пабудавалі на свае апошнія сродкі перад самой вайной, і амаль што цалкам разбіты другі, стары касцёл, які быў перададзены ў 1866 г. пад царкву. Наша парафія знаходзіцца ў самой прыфрантавой паласе і яе таксама знішчылі, як і наш касцёл. Самі не маем дамоў, а жывём мы ў акопах і ямах, так што не можам узвесці самі не толькі новы храм, але нават адрамантаваць разбітыя муры старога касцёла, які быў забраны пад царкву» [27, арк. 1].

Фонд 473 «Дзяржаўнае бюро аднаўлення Браслаўскага павета» (1921–1924 гг.) утрымлівае цыркуляры, пастановы і інструкцыі Савета Міністраў ІІ Польскай Рэспублікі, Міністэрства грамадскіх работ, пратаколы пасяджэнняў бюро аднаўлення і камісіі па аказанні дапамогі насельніцтву Браслаўскага павета, перапіску з акруговай дырэкцыяй аднаўлення і гміннымі праўленнямі, журнал уліку маёмасці насельніцтва, знішчанай у гады Першай сусветнай вайны, касавую кнігу, матэрыялы аб аказанні дапамогі насельніцтву і кампенсацыі ўрону, нанесенага гаспадаркам і грамадзянам баявымі дзеяннямі (заявы грамадзян, планы будаўніцтва дамоў і збудаванняў, акты на атрыманне крэдыту для аднаўлення пабудоў і інш.). Таксама там ёсць спісы грамадзян, якія пацярпелі падчас Першай сусветнай вайны, праектныя матэрыялы (планы, чарцяжы дамоў). Уважлівае прачытанне гэтых дакументаў дае магчымасць ацаніць маштаб страт для сем’яў звычайных сялян. Напрыклад, жыхар в. Заборныя Гумны Браслаўскага павета Ісідар Сірко ў час пажару страціў усе пабудовы, акрамя старой стадолы. Таму ў асабістай заяве 24 ліпеня 1921 г. прасіў выдаць яму бясплатна 150 пнёў будаўнічага лесаматэрыялу ці за грошы па фіксаванай дзяржаўнай цане ў доўгатэрміновы крэдыт. «Нагадваю аб тым, што жыву пад адкрытым небам з сям’ёй 7 душ. Лёс мой плачэўны» [28, арк. 24]. Такія крыніцы з’яўляюцца перспектыўнымі для правядзення культурна-антрапалагічных і інш. даследаванняў па мікрагісторыі (павета, гміны ці асобнага населенага пункта).

**Заключэнне**

У ходзе праведзенага архіва- і крыніцазнаўчага даследавання дакументаў 149 фондаў перыяду 1918–1939 гг., якія захоўваюцца ў Занальным дзяржаўным архіве ў г. Маладзечна. Устаноўлена, што сярод іх па колькасных паказчыках дамінуюць фонды мясцовых органаў дзяржаўнай улады (Віленскага ваяводскага ўпраўлення, павятовых старостваў, начальнікаў раёнаў Грамадзянскага ўпраўлення ўсходніх зямель). Тэрыторыя паходжання архіўных збораў абмежавана Браслаўскім, Вілейскім, Віленска-Трокскім, Дзісенскім, Дунілавіцкім, Маладзечанскім, Ашмянскім, Пастаўскім, Свянцянскім паветамі Віленскага ваяводства і Валожынскім паветам Навагрудскага ваяводства. Храналагічна яны ахопліваюць перыяд ад аднаўлення Польскай дзяржавы ў 1918 г., польска-савецкай вайны да ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР восенню 1939 г. Фрагментарна і ў невялікай колькасці захаваліся дакументы аб дзейнасці грамадскіх арганізацый і палітычных партый, працы фінансавых органаў, устаноў сацыяльнага забеспячэння, сувязі, нізавых (гмінных) органаў мясцовага самакіравання. Нярэдка яны прадстаўлены адзінкавымі справамі. Архіўныя матэрыялы адрозніваюцца па ступені захаванасці. Добра захаваліся дакументы павятовых старостваў, судоў і павятовых камендатур паліцыі. Сярод матэрыялаў мясцовых органаў дзяржаўнай улады і органаў мясцовага самакіравання пераважаюць дакументы аб становішчы сельскай гаспадаркі, праблематыцы аграрнай рэформы, асадніках, распараджэнні землямі і нерухомасцю, падліку страт ад разбуральных вынікаў Першай сусветнай вайны і пасляваенным аднаўленні. Вялікую каштоўнасць для рэгіянальных і генеалагічных даследаванняў маюць дакументы выбарчых камісій. Аднак адсутнічаюць самастойныя фонды адвакатаў, падатковых органаў, транспартных арганізацый і прамысловых прадпрыемстваў, устаноў аховы здароўя, канфесійных структур і інш. Асноўнай прычынай фрагментарнасці ці адсутнасці дакументаў з’яўляюцца незваротныя страты архіўных збораў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Цяпер патрабуецца ўдасканаленне навукова-тэхнічнай апрацоўкі фондавых матэрыялаў

у адпаведнасці з сучаснымі навукова-метадычнымі і тэхналагічнымі патрабаваннямі. У цэлым, наяўныя дакументальныя зборы Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна з'яўляюцца каштоўнымі крыніцамі для далейшых гістарычных, культурна-антрапалагічных, гісторыка-краязнаўчых, генеалагічных і іншых даследаванняў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Зональный государственный архив в г. Молодечно : путеводитель 1919–1941, 1944–2007 / Департамент по архивам и делопроизводству Министерства юстиции Респ. Беларусь ; сост.: М. П. Кириленко [и др.]. – Молодечно : Новопринт, 2014. – 339 с.

2. Зональный государственный архив в г. Молодечно – история архива [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://archmol.by/Istor_archiva_p_1.htm. – Дата доступа: 12.08.2014.

3. Polska – Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne : przewodnik po materiałach archiwalnych 1918–1939 / oprac. i red. nauk.: E. Rosowska [i in.]. – Warszawa : AMALKER, 2013. – T. 1 : Archiwum Państwowe Obwodu Brzeskiego, Archiwum Państwowe Obwodu Grodzieńskiego. – 361 s.

4. Государственный архив Минской области и его филиал в городе Молодечно : путеводитель (1917–1941 гг.) / Арх. упр. при Совете Министров БССР ; Арх. отдел исполкома Минск. обл. Совета депутатов трудящихся; редкол.: Т. А. Воробьева [и др.] ; сост.: Г. А. Гречкин [и др.]. – Минск : Полымя, 1967. – 188 с.

5. Государственные архивы Брестской, Гродненской областей, филиал Государственного архива Минской области в Молодечно : справочник (по докум. материалам 1919–1939 гг.) / Арх. упр. при Совете Министров БССР ; Арх. отд. исполкомов Брест., Гродн., Минск. обл. Советов депутатов трудящихся; сост.: Т. Д. Либеровская (отв. сост.) [и др.]. – Минск : Полымя, 1969. – 80 с.

6. Документы по истории православной церкви на Беларуси XVIII – XX вв. в фондах государственных архивов Республики Беларусь : межархив. справ. / Комитет по архивам и делопроизводству Респ. Беларусь ; НАРБ ; Европейский фонд «Диалог» ; авт.-сост.: О. А. Добычина [и др.]. – Минск : БелНИИДАД, 2003. – 284 с.

7. Документы по истории и культуре евреев в архивах Беларуси / под ред. М. С. Куповецкого, Э. М. Савицкого, М. Веба. – М. : РГГУ ; ЕТСА ; ИВО, 2003. – 607 с.

8. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР : док. и материалы : в 2 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ ; Филиал Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС ; Ин-т истории АН БССР ; Арх. упр. при Совете Министров БССР. – Минск : Госиздат БССР, 1962. – Т. 1 : 1921–1929 гг. – 620 с.

9. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР : док. и материалы : в 2 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ ; Филиал Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС ; Ин-т истории АН БССР ; Арх. упр. при Совете Министров БССР. – Минск : Беларусь, 1972. – Т. 2 : 1929–1939 гг. – 560 с.

10. Революционный авангард трудящейся молодёжи Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) : док. и материалы / Ин-т ист. партии при ЦК КПБ ; филиал Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС ; Гл. арх. упр. при Совете Министров БССР / сост.: М. А. Бобёр [и др.]. – Минск : Изд-во БГУ, 1978. – 327 с.

11. Памяць: Гіст.-дак. хроніка Валожынскага раёна. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 454 с.

12. Памяць: Гіст.-дак. хроніка Пастаўскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2001. – 688 с.

13. Памяць: Гіст.-дак. хроніка Маладзечна і Маладзечанскага раёна. – Мінск : БелЭн, 2002. – 792 с.

14. Памяць: Гіст.-дак. хроніка Браслаўскага раёна. – Мінск : Паліграфафармленне, 1998. – 709 с.

15. Памяць: Гіст.-дак. хроніка Глыбоцкага раёна. – Мінск : БелЭн, 1995. – 454 с.

16. Памяць: Гіст.-дак. хроніка Міёрскага раёна. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 630 с.

17. Памяць: Гіст.-дак. хроніка Мядзельскага раёна. – Мінск : БелЭн, 1998. – 640 с.

18. Памяць: Гіст.-дак. хроніка Шаркаўшчынскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2004. – 512 с.

19. Памяць: Гіст.-дак. хроніка Смаргонскага раёна. – Мінск: БелЭн, 2004. – 640 с.

20. Фондовый каталог государственных архивов Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://fk.archives.gov.by/catalogue/. – Дата доступа: 12.05.2015.

21. Polska – Białoruś – wspólne dziedzictwo historyczne : przewodnik po materiałach archiwalnych 1918–1939 / oprac. i red. nauk. E. Rosowska [i in.]. – Warszawa : Stowarzyszenie Archiwistów Polskich, 2014. – T. 2 : Rejonowe Archiwum Państwowe w Mołodecznie, Archiwum Narodowe Republiki Białorusi, Białoruskie Państwowe Archiwum-Muzeum Literatury i Sztuki, Centralna Biblioteka Naukowa im. Jakuba Kołasa. – 304 s.

22. Сумесны польска-беларускі праект «Польшча – Беларусь: агульная гістарычная спадчына» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://archiwa.gov.pl/wspolne-dziedzictwo/.

23. Інструкцыя і ўказанні дэпартамента ўнутраных спраў па ўліку ўрону, нанесенага баявымі дзеяннямі ў час вайны 1915–1918 гг. і перапіска з раёнамі па ўліку страт (1921–1922 гг.) // Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна (ЗДАМ). – Ф. 382. Воп. 1. Спр. 35.

24. Перапіска з павятовым старостам аб барацьбе з распаўсюджваннем ідэалогіі сярод насельніцтва, што прапагандуецца партыяй «Вызваленне», аб барацьбе з нелегальным пераходам дзяржаўнай мяжы, аб закрыцці беларускіх школ і інш. (1925 г.) // ЗДАМ. – Ф. 55. Воп. 1. Спр. 8.

25. Указанні Міністэрства асветы, папячыцельства аб выкананні праграмы па беларускай мове і фізічнай падрыхтоўцы, аб арганізацыі курсаў па ўдасканаленні школьных урачоў і настаўнікаў, аб арганізацыі выезду навучэнцаў за мяжу ў час летніх канікулаў і інш. (1928 г.) // ЗДАМ. – Ф. 204. Воп. 1. Спр. 140.

26. Хадайніцтва Гальшанскай каталіцкай парафіі аб кампенсацыі ўрону, нанесенага баявымі дзеяннямі ў 1915 г. (13.01.1922 г.) // ЗДАМ. – Ф. 350. Воп. 1. Спр. 6389.

27. Хадайніцтва камітэта парафіі Смаргонскай гміны аб кампенсацыі ўрону, нанесенага баявымі дзеяннямі ў 1915 г. (27.12.1921 г.) // ЗДАМ. – Ф. 350. Воп. 1. Спр. 6394.

28. Заявы грамадзян на будаўніцтва дамоў (1921–1924 гг.) // ЗДАМ. – Ф. 473. Воп. 1.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 25.06.2015

***Vabishchevich A.M.*** **Documents of Regional State Archives in Molodechno as Sources on the History of Western Belarus in the 1918–1939s**

*The article presents the results of archival research and study of sources research conducted by the author in a joint Polish-Belarusian project «Poland – Belarus. Common historical heritage». The object of the study is on the documents of the period 1918–1939s, which are stored in the Regional State Archives in Molodechno, Minsk region (Republic of Belarus). Archival materials cover part of Western Belarus (9 districts of Wilno province and Volozhin district of Novogrudok province), which was part of the Polish state. The author conducted the analysis of funds, inventories of funds, realized characteristic of archival collections, established the degree of safety, defined prospects of the documents for research.*